# Гэта звычайны папулізм

## —лічыць старшыня рэспубліканскага Дзяржэканомплана С. Лінг

**На нашу думку, сустрэча абяцае ператварыцца ў шматтысячны мітынг.**

**Што гэта? Чарговае процістаянне ўлад і працоўных калектываў, як гэта ўжо было ў красавіку? Толькі цяпер у ролі завадатараў выступаюць афіцыяльныя прафсаюзы?**

**Наш карэспандэнт звярнуўся да старшыні Дзяржэканомплана Беларусі С. ЛІНГА з просьбай пракаменціраваць сітуацыю і ўвогуле абмаляваць цяперашняе эканамічнае становішча рэспублікі. Вось што ён расказаў:**

— Я не разумею, чаму раптам прафсаюзы вырашылі пайсці на гэты крок? Прычым нельга не звярнуць увагі на адпаведную падрыхтоўку ўсёй акцыі. Напрыклад, Мінскі абласны савет прафсаюзаў збіраў нараду старшынь прафкомаў—на яе быў запрошаны і наш прафсаюзны лідэр, з Дзяржэканомплана — і там параілі, каб на плошчу вывелі пэўную колькасць людзей. Што гэта? Імкненне скарыстаць гэты ўвогуле нялёгкі для ўсіх нас перыяд, нажыць нейкі палітычны капітал, паказаць ураду мускулы, аднавіць аўтарытэт? Не разумею. На мой погляд, гэта звычайны папулізм.

Тыдні два назад мы разам з першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў Беларусі М. Мясніковічам былі запрошаны на пасяджэнне прэзідыума савета Федэрацыі, які падводзіў вынікі выканання пагаднення, заключанага паміж урадам і прафсаюзамі. Якіх-небудзь прэтэнзій да ўрада не было, выказваліся заўвагі толькі па асобных момантах пагаднення. Словам, ніякай канфрантацыі. І раптам...

Так, мінусаў у нашай рабоце шмат, мы самі многім не задаволены. Аднак усё адносна. Трэба ж улічваць агульную сітуацыю, агульную нестабільнасць. Многія сувязі страчаны, старыя структуры разбураны, новыя не наладжаны... Няўжо гэтага ў савеце Федэрацыі не разумеюць?

Тым не менш, нягледзячы на неспрыяльныя моманты, наша эканоміка трымаецца на паверхні, яна захавана ад развалу. Мы ўжо маем папярэднія даныя за 9 месяцаў. Спынены спад вытворчасці, а ў ліпені, жніўні, верасні нават ідзём з перавышэннем узроўню мінулага года. Хоць варта прызнаць: асобныя галіны — хімічная, лёгкая прамысловасць і харчовая — адстаюць па-ранейшаму, і гэта звязана ў першую чаргу з адсутнасцю імпартных сыравіны і матэрыялаў. Вельмі важна, што мы выходзім з дэфіцытам бюджэту 4,3 мільярда рублёў замест 5,1, як планавалася. Такім чынам, і антыкрызісная праграма таксама ў асноўным выконваецца.

Далей: як будзем зімаваць?

Ужо вядома: знізіліся закупкі ў дзяржаўныя рэсурсы мяса і малака адпаведна на 4 і 11 працэнтаў, сёлета меншы ўраджай збожжа, бульбы, але гэта на забеспячэнні насельніцтва не адаб'ецца, бо зменшаны іх пастаўкі ў саюзны фонд. Вырашаецца пытанне па пастаўках у рэспубліку цукру і алею. Я падкрэсліваю: забеспячэнне прадуктамі харчавання захаваецца на ўзроўні мінулага года. Будуць зроблены таксама неабходныя запасы паліва на зіму.

Што з зарплатай?

Па-першае, адзначу: пасля вядомай рэформы на павышэнне даходаў насельніцтва рэспублікі пайшло 10,5 мільярда рублёў, а выручка ад павышэння цэн склала 11 мільярдаў. Могуць сказаць: толькі і выНік, што грошай напампавалі. Ды не. Мы аднавілі ў адносінах да Беларусі, якая заўсёды вызначалася лепшымі паказчыкамі ў працы, справядлівасць. Калі ў першым квартале сёлетняга года сярэдняя зарплата ў нас была 291 рубель, нават ніжэй на тры рублі, чым у сярэднім па Саюзу, то за першае паўгоддзе яна склала 434 рублі (параўнайце: па Саюзу 406). Гэта чацвёртая пазіцыя пасля рэспублік Прыбалтыкі, аднак улічым, што там і цэны вышэй. Зазначу таксама, што зарплата няўхільна расце, і мы выйдзем на двухразовае яе павышэнне ў наступным годзе, як і абяцаў урад. Па апошніх даных, напрыклад, у аб'яднанні «Ваўкавыскцэментнашыфер» яна складае (нагадваю: сярэдняя) 780,5 рубля, на Новалукомскай ДРЭС — 744,3... Даходы рушылі ўгору, і гэта таксама меры антыкрызіснай праграмы. Урадам падрыхтавана канцэпцыя рэформы заработнай платы, распрацаваны праект Закона «Аб мінімальнай заработнай плаце і дзяржаўных сацыяльных гарантыях у галіне аплаты працы».

Разам з тым вядома, што мець 1000 рублёў яшчэ лепей. Сёння многія менавіта і патрабуюць: «Дай!» Але ўрад можа даць толькі тое, што мае само грамадства. Урад увогуле павінен абараняць, як кажуць цяпер, толькі абяздоленых.

Ці, можа, менавіта за кошт пенсіянераў, інвалідаў некаму і даць?

Аднак давайце цяпер паглядзім, што канкрэтна патрабуюць прафсаюзы?

Па-першае, паскорыць распрацоўку і прыняцце заканадаўчых актаў аб працы, зар-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы